# Фэстываль без (палітычнага) фальклёру

Фэстываль беларускае песьні наведваю рэгулярна. Адзін зь сяброў, пабачыўшы мяне ў залі, зьдзівіўся: “А ты што тут робіш, калі ня мусіш?” (ён мусіў).

А я проста прысутны. Эстрадная творчасьць фактычна ня вельмі каб мяне цікавіла. Праўда, бывае на што паглядзець, бо ёсьць у беларускай песьні маладыя сілы, але наконт слуханьня, дык з году ў год страшней. Мастацкі ўзровень быццам бы расьце, але коштам нечуванай саветызацыі. Інструктары зь Беларусі прышчапляюць нашым ансамблям свой невыносны выканаўчы манер. Да таго ж менскія краўцы апранаюць артыстаў у свае фабрычныя вырабы.

Паколькі мне мядзьведзі па вушах хадзілі, самай цікавай часткай галя–канцэрту было для мяне выступленьне Уладзімежа Цімашэвіча. Верная публіка ўзнагародзіла яго, як заўжды, бурнымі апладысмэнтамі, пачынаючы ўжо зь ягонага ўваходу ў залю і шмат разоў перарываючы прамову.

Самы вядомы пасол беластоцкай зямлі падзяліўся са сваімі выбарнікамі нядаўняй архіўнай знаходкай. Аказваецца, трыста гадоў таму Цімашэвічы ахоўвалі Белавескую пушчу. Быў сярод іх і Цімашэвіч на імя Дымітар. Публіка тонкую алюзію зразумела і ўзнагародзіла нашчадка Дымітра чарговай порцыяй воплескаў. Білі ў ладкі і тады, калі пасол дэкляраваў, што будзе адводзіць на зьбяднелае апошнім часам БГКТ частку сваёй зарплаты, хаця і не назваў канкрэтнай сумы.

Усё ж такі адчувалася, што ўсё гэта ня тое, калі перапоўненая заля трашчала была ад натоўпу беларускага люду. А шаноўных гасьцей колькі было! Зьніклі ўсе: міністры, ваяводы і прэзыдэнты. Сёлета заля была поўная, але кожны змог сесьці, і мужчына, які прадбачліва прынёс раскладное крэсла, выглядаў недарэчна.

Асабліва пустым падаўся калідор — маё ўлюбёнае месца на фэстывалі. Адзін кемлівы малады чалавек выказаў думку, быццам прычына апусьцеласьці калідору — у адсутнасьці “апазыцыянэраў”, якія заўжды стаялі тут і ўсё раскрытыкоўвалі.

Што ж, колькі можна займацца неканструктыўнай крытыкай! Фэстываль стаў даволі звычайным культурным мерапрыемствам і праводзіўся зусім спраўна. Гледачы заплацілі па 20 злотых і за гэта мелі добры час, як кажуць беларускія амэрыканцы. Відаць, так і павінна быць, але для мяне фэстываль без палітычнага фальклёру страціў сваю прыцягальную сілу.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1998. 8 сакавіка. № 10. С. 5.